З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«ДЫВЕРСІФІКАВАЦЦА НАМ ТРЭБА»

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка абмеркаваў з кіраўніцтвам урада і нафтаперапрацоўчай галіны магчымасць альтэрнатыўных паставак нафты і павышэння эфектыўнасці экспарту нафтапрадуктаў

«Мы павінны на гэтай нарадзе ў вузкім коле спецыялістаў разгледзець пытанне пра далейшую работу нашага нафтахімічнага комплексу, — абазначыў тэму сустрэчы кіраўнік дзяржавы. — У дадзеным выпадку пытанне стаіць пра пастаўкі нафты ў Беларусь, у тым ліку з сусветных рынкаў, не толькі з Расійскай Федэрацыі, што мы ўжо пачалі рабіць. Мы павінны паглядзець, у што гэта выльецца».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што пытанне дыверсіфікацыі паставак нафты не траціць сваёй актуальнасці. «Сапраўды, цяпер у поўным аб'ёме няма альтэрнатывы пастаўкам расійскай нафты. Але, як мы і дамаўляліся, дыверсіфікавацца нам трэба. ***Трэба ісці да таго, каб працэнтаў 30-40 купляць у Расійскай Федэрацыі, працэнтаў 30 мы павінны з Балтыкі завозіць нафты, працэнтаў 30 — праз Украіну праверaным ужо шляхам.*** Магчыма, Казахстан зможа паставіць нам нафту, калі Расія пагодзіцца з гэтым. Дзіўна: наш саюзнік не дае згоды на пастаўку нафты ад нашага іншага саюзніка. Што ж, такая сітуацыя цяпер па пастаўках нафты, і мы павінны з гэтым разабрацца», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Але самае важнае пытанне — перапрацоўка нафты і далейшы продаж нафтапрадуктаў — гэта для эканомікі значны рэсурс. Праблемы ёсць і тут — з-за ўвядзення Расійскай Федэрацыяй падатковага манеўру непазбежна зніжаюцца даходы рэспубліканскага бюджэту, пагаршаецца эфектыўнасць работы айчынных нафтаперапрацоўчых заводаў. НПЗ сутыкнуліся з праблемай фінансавання бягучай дзейнасці і, што немалаважна, сваіх інвестыцыйных праграм, накіраваных на развіццё вытворчасці. Але тут кіраўнік дзяржавы быў катэгарычны: ***«Гэтыя аргументы я нават да ўвагі прымаць не хачу. Вайны няма. У свеце грошай мора. Ёсць кіраўнікі канцэрнаў, ва ўрадзе — віцэ-прэм'ер, кіраўнікі заводаў. Вырашайце пытанні».***

Фота БелТА.

Кіраўнік дзяржавы папрасіў паведаміць прагнозы развіцця сусветнага рынку нафты і нафтапрадуктаў на найбліжэйшы час і на сярэднетэрміновую перспектыву, а таксама тое, якія ўрад бачыць рэзервы па павышэнні эфектыўнасці экспарту нафтапрадуктаў у цяперашніх умовах.

Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў аб персанальнай адказнасці за ўсе прапановы. ***«Калі хтосьці бачыць, што мы экспартаваць можам прадукцыю па двух-трох каналах або манапалізаваць працэс экспарту, — кожная прапанова павінна быць разгледжана,*** — сказаў лідар дзяржавы. — А то ў нас разважанняў шмат, балбатні шмат, рашэнні з-за балбатні не прымаюцца, а калі рашэнне прымуць, потым няма з каго спагнаць».

Ён яшчэ раз падкрэсліў, што нават калі кіраўнікі не застануцца на сваіх пасадах, будуць «галавой адказваць за прынятыя рашэнні».

Перасцярог Аляксандр Лукашэнка прысутных і ад прыватных прыхільнасцяў і інтарэсаў.

«Увесь свет працуе, прыкладаў шмат, любы бярыце з іх і давайце ў гэтым кірунку дзейнічаць», — звярнуўся да ўдзельнікаў нарады Прэзідэнт.

ПЕРАГАВОРЫ ПРАЦЯГВАЮЦЦА

«Немалаважным аспектам нарады было павышэнне эфектыўнасці як, уласна, аперацыйных выдаткаў нашых заводаў, так і рэалізацыі нафтапрадуктаў на знешнім перыметры, — пракаментаваў вынікі размовы з Прэзідэнтам **кіраўнік «Белнафтахіма» Андрэй РЫБАКОЎ.** — Размова ідзе пра найбліжэйшыя рынкі: Украіну, Польшчу, Прыбалтыку. Дадзены канкрэтныя даручэнні наконт працягу работы па ўсіх гэтых кірунках. У найбліжэйшы час нас чакае маштабная, планамерная праца, разлічаная нават не на адзін год, а на будучыя два-тры гады».

Беларусь пакуль не выйшла на запланаваныя ў студзені—лютым аб'ёмы экспарту нафтапрадуктаў, удакладніў ён, тым не менш пасля невялікага перапынку знешні продаж аднавіўся.

Пачатку разгрузкі нарвежскай нафты, пра пастаўкі якой нядаўна ўдалося дамовіцца, канцэрн чакае ўжо ўвечары 22 студзеня.

«Альтэрнатыўныя пастаўкі прапрацоўваюцца, не буду анансаваць, але ёсць ужо гатовыя кантакты, гэта датычыцца не толькі самой нафты, але і лагістычных каналаў яе паступлення, — сказаў Андрэй Рыбакоў. — Гэта ўжо будзе не па партах і чыгункі, гэта будуць ужо іншыя напрамкі. Мы цяпер працуем па розных кірунках».

Што датычыцца выгады ад дыверсіфікацыі паставак нафты, старшыня канцэрна заўважыў: «Ёсць добры прынцып не складваць усе яйкі ў адзін кошык. Таму выгада мае комплексны падыход. Пры комплексным падыходзе ты недзе можаш губляць, недзе знаходзіць, але сумарны эфект атрымліваеш станоўчы».

Што датычыцца перамоў з расійскім бокам, то яны працягваюцца як на ўзроўні кампаній, так і на ўзроўні Міністэрства энергетыкі Расійскай Федэрацыі і канцэрна «Белнафтахім». «Безумоўна, мы чакаем, што перагаворныя працэсы ў найбліжэйшы час працягнуцца і на вышэйшым узроўні», — дадаў Андрэй Рыбакоў.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

❍ У тэму

На пачатку года канцэрн «Белнафтахім» паведамляў, што кошт нафты для беларускіх НПЗ з улікам падатковага манеўру ў РФ вырасце ў 2020 годзе больш чым на $20 за 1 т, што складае 5 % да ўзроўню цаны 2019 года. У папярэднія гады цэны на паліва на ўнутраным рынку стрымліваліся, у выніку гэтага НПЗ былі вымушаныя нарасціць крэдытную запазычанасць, што пагоршыла фінансавы стан. У 2018 годзе было пачата выраўноўванне цэнавай сітуацыі на ўнутраным рынку, якое паступова дазволіла НПЗ выйсці на эфектыўную работу. Пры гэтым беларускія цэны на маторнае паліва застаюцца на 30-40 % ніжэйшыя, чым на сумежных еўрапейскіх і ўкраінскім рынках.

Беларускія НПЗ сістэмна павышаюць эфектыўнасць і зніжаюць затраты на вытворчасць за кошт мадэрнізацыі і рэканструкцыі тэхналагічных аб'ектаў, паведамляў канцэрн. Эканамічны эфект ад рэалізацыі мерапрыемстваў па зніжэнні выдаткаў за 2019 год «Белнафтахім» ацаніў у $60 млн.

Цэны на аўтамабільнае паліва канцэрн павышае паэтапна. «За 2019 год цэны на маторнае паліва ў рэспубліцы ў сярэднім былі павялічаныя на 13 %, у той час як сусветная каціроўка нафты за названы перыяд вырасла на 17 %», — звярталі ўвагу ў канцэрне.

Апошняе змяненне цэн на бензін (трэцяе з пачатку года) адбылося ў Беларусі 19 студзеня. Цана АІ-92-К5-Еўра склала 1,67 рубля, АІ-95-К5-Еўра — 1,77 рубля, АІ-98-К5-Еўра — 1,99 рубля, ДП — 1, 77 рубля.

«Космас — гэта лакмусавая паперка, якая дапамагае ацаніць магчымасці і здольнасці дзяржавы і народа»

Стаўка на развіццё высокіх тэхналогій і космасу ў прыватнасці — прыярытэт для нашай краіны, якая не валодае значнымі прыроднымі рэсурсамі. *«Беларусь заўсёды зарабляла за кошт мазгоў і рук людзей, за кошт кампетэнцый і кваліфікацыі нашых людзей»*, — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падчас сустрэчы з генеральным дырэктарам расійскай Дзяржаўнай карпарацыі па касмічнай дзейнасці «Раскосмас» Дзмітрыем Рагозіным.

Кіраўнік краіны і дырэктар карпарацыі абмяркоўвалі магчымасці ўдзелу Беларусі ў касмічнай праграме «Раскосмасу» і іншыя кірункі сумеснай работы ў галіне. Установа цесна супрацоўнічае з Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі і шматлікімі прадпрыемствамі, сярод якіх «Пеленг», «Інтэграл».

«Шмат было задумак, многія рэалізаваны. Мы ведаем, і вы лепш за мяне ведаеце, што лятае на арбіце, што належыць Беларусі там. ***Мы робім не тое што першыя крокі ў космасе, а робім магчымыя крокі ў космасе»***, — звярнуўся Аляксандр Лукашэнка да суразмоўца.

Асваенне космасу, безумоўна, рэч дарагая, але, па словах Прэзідэнта, — прыярытэтная для нашай краіны, як і іншыя высокатэхналагічныя праекты. Космас, атамная энергетыка — вядучую ролю ў рэалізацыі гэтых праграм адыгрывае падтрымка Расіі. «Мы ў Беларусі стараемся высокія тэхналогіі развіваць па ўсіх кірунках», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. «Космас — гэта лакмусавая паперка, якая дапамагае ацаніць магчымасці і здольнасці дзяржавы і народа», — заўважыў ён.

У знак падзякі за супрацоўніцтва Дзмітрый Рагозін прэзентаваў Прэзідэнту Беларусі пальчатку касманаўта, які ў 2019 годзе пабываў у космасе. З чыёй рукі гэты «касмічны» падарунак, ён публічна не прызнаўся, каб іншыя касманаўты не раўнавалі. «Гэта першы ў мяне такі легендарны падарунак», — падзякаваў Аляксандр Лукашэнка.

Марыя ДАДАЛКА.

❍ Каментарый у тэму

Сярод асноўных партнёраў расійскай карпарацыі ў Беларусі Дзмітрый Рагозін назваў «Пеленг», які стварае ўнікальную мэтавую апаратуру для шэрагу касмічных апаратаў. «У гэтым плане расійска-беларускае супрацоўніцтва, калі б яно было больш цеснае (і Аляксандр Рыгоравіч пацвердзіў волю беларускай дзяржавы працаваць так), дазволіла б стварыць цэлую серыю апаратаў у рамках групоўкі дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі з выкарыстаннем беларускай аптычнай апаратуры», — заявіў генеральны дырэктар «Раскосмасу». Адзначыў ён і яшчэ адно беларускае прадпрыемства — лідара ў мікраэлектроніцы савецкіх часоў «Інтэграл». Праектаванне электроннай, радыяцыйна трывалай кампанентнай базы для касмічнага прызначэння — вельмі сур'ёзны кірунак для супрацоўніцтва.

«Канешне, вельмі хацелася б зрабіць сумесны апарат, вельмі хацелася б адправіць і касманаўта Рэспублікі Беларусь у будучыні, але сёння мы пачынаем маштабнае супрацоўніцтва. Раней ішлі перагаворы пра магчымую куплю беларускіх прадпрыемстваў расійскімі інтэгравanымі структурамі. Я лічу, што гэта не зусім слушны шлях, — сказаў Дзмітрый Рагозін. — Цяпер мы гаворым не пра набыццё адно ў аднаго якіхсьці актываў, а пра складанне гэтых актываў у рамках сумесных прадпрыемстваў і інтэграваных структур».

▸ ДАВЕДКА

Беларускі касмічны апарат і расійскі касмічны апарат дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі «Канопус-В» № 1 складаюць сумесную арбітальную групоўку. Мэты касмічнага праекта досыць зямныя — маніторынг тэхнагенных і прыродных надзвычайных сітуацый, кантроль за землекарыстаннем, лясным фондам, нафтагазавымі аб'ектамі і экалогіяй. Нацыянальная акадэмія навук Беларусі і Дзяржаўная карпарацыя па касмічнай дзейнасці «Раскосмас» у найбліжэйшыя дні падпішуць пагадненне аб пашырэнні магчымасцяў сумеснай арбітальнай групоўкі з выкарыстаннем расійскіх касмічных апаратаў.

З 22 да 23 студзеня ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі адбудзецца першае пасяджэнне Міждзяржаўнага савета па космасе Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Удзельнічаць будуць дэлегацыі Расіі, Арменіі і Казахстана. На парадку сустрэчы — пытанні па інтэграцыі наземных інфраструктур, якія выкарыстоўваюць сігналы сістэмы ГЛАНАСС, рэалізацыі сумесных праектаў у галіне выкарыстання касмічнай прасторы ў мірных мэтах.